Бранчэль К. І., магістрант
завочнай формы навучання
Навуковы кіраўнік – Густова-Рунцо Л. А.,
доктар мастацтвазнаўства, прафесар

# ІНТЭРПРЭТАЦЫЯ АГІЯГРАФІЧНАГА ВОБРАЗА ПРАПАДОБНАЙ ЕЎФРАСІННІ ПОЛАЦКАЙ У БЕЛАРУСКАЙ СКУЛЬПТУРЫ XXI СТАГОДДЗЯ

Рэлігія мае важнае значэнне ў сацыяльным жыцці грамадства. Амаль у кожнай краіны ёсць свой нябесны заступнік. Так, у Балгарыі гэта святыя Кірыл і Мяфодзій, у Літве, Польшчы і Расіі – святы Казімір. У Беларусі таксама ёсць свая нябесная заступніца – святая прападобная Еўфрасіння Полацкая.

Асоба святой Еўфрасінні Полацкай надзвычай важная для беларускага народа. Дачка віцебскага князя, якая змяніла княжацкія пакоі на манастырскія лавы, прысвяціўшы сябе служэнню Богу і асветніцкай справе. Прыняўшы пострыг, яна актыўна займалася асветніцкай дзейнасцю. Добра вядома, што святая Еўфрасіння перапісвала кнігі, што на той час было складанай справай, да якой жанчыны амаль не дапускаліся. Яна заснавала два манастыры – мужчынскі і жаночы, праз яе намаганні папаўнялася бібліятэка Сафійскага сабора і для якога быў набыты ўнікальны абраз Маці Божай Адзігітрыі Эфескай. Прападобная Еўфрасіння Полацкая выступала і як мецэнатка: па яе загадзе была закладзена царква святога Спаса [2]. І, канешне, нельга не адзначыць сакральную для беларускага народа рэліквію – Крыж, зроблены Лазарам Богшам па замове святой.

Мы ведаем пра жыццё і дзейнасць святой асветніцы з яе жыція. Акрамя гэтага, праводзіліся даследаванні іншых крыніц, археалагічныя раскопкі для таго, каб знайсці новыя звесткі. Аднак улічваючы, што прайшло шмат часу, усё роўна застаюцца “белыя плямы” ў біяграфіі святой.

Асоба Еўфрасінні Полацкай цікавіць пісьменнікаў, мастакоў, музыкантаў, драматургаў, якія ў сваіх творах інтэрпрэтуюць вобраз, прадстаўлены ў агіяграфіі.

У беларускім мастацтве вобраз Еўфрасінні Полацкай з’яўляецца надзвычай папулярным. У гонар яе складаліся вершы і проза, выконваліся музычныя кампазіцыі, пра яе здымалі фільмы (як дакументальныя, так і мастацкія), на сцэнах тэатраў ставіліся спектаклі, у тым ліку і лялечны, яе вобраз адлюстраваны на мностве карцін. Аднак кожны з аўтараў увасобіў у гэтых вобразах нешта індывідуальнае.

У нашай рабоце мы вырашылі прааналізаваць, як інтэрпрэтаваўся вобраз святой прападобнай Еўфрасінні Полацкай у беларускай скульптуры XXI стагоддзя.

Усяго ў Беларусі налічваецца тры помнікі Еўфрасінні Полацкай. Два з іх у Мінску, і адзін – у Полацку.

Першы помнік прападобнай з’явіўся ў 1999 годзе ва ўнутраным дворыку Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ў Мінску. Аўтар помніка – віцебскі скульптар Ігар Голубеў. Што цікава, разам з помнікам святой размяшчаюцца помнікі такім беларускім асветнікам, як Васіль Цяпінскі, Сымон Будны, Мікалай Гусоўскі, Кірыл Тураўскі і Францыск Скарына. Відавочна, гэта зроблена з мэтай таго, каб падкрэсліць, што Еўфрасіння Полацкая працавала не толькі ў рэлігійным кірунку, але і несла асвету на беларускія землі.

У помніку аўтар адлюстроўвае сваё бачанне вобраза Еўфрасінні Полацкай. Святая прадстаўлена ў манаскім адзенні з крыжам на грудзях. Аднак, на нашу думку, аўтар звяртае больш увагі на асветніцкую дзейнасць святой. Прападобная ў левай руцэ трымае разгорнутую кнігу, а ў правай – пяро. З правага боку ад яе размяшчаецца стол, на якім ляжаць кнігі і пергамент, а таксама стаіць чарнільніца. Усё гэта паказвае на той факт, што Еўфрасіння Полацкая займалася перапісваннем кніг. Гэта можна супаставіць з наступнымі радкамі з “Жыція…” прападобнай: “Так жыла яна нейкі час у манастыры, а пасля папрасіла епіскапа Ілью, што кіраваў пасадам Святой Сафіі ў Полацку, каб той дазволіў ёй жыць у царкве Святой Сафіі ў мураванай келлі. І ён дазволіў ёй жыць там. І яна увайшла туды, і ўчыніла найпадзвіжнейшы подзвіг посту, і пачала пісаць кнігі сваімі рукамі, і прыбытак ад продажу іх аддавала тым, хто быў у нястачы” [1]. Такім чынам яна спрыяла тыражаванню Евангелля.

Другі помнік Еўфрасінні Полацкай быў усталяваны на яе радзіме, у Полацку, 28 верасня 2000 года. Аўтарам помніка зноў стаў Ігар Голубеў. Вельмі цікава прасачыць тыя адрозненні, якія выявіліся ў двух работах аднаго аўтара. У першым выпадку аўтар робіць акцэнт на асветніцкай дзейнасці святой, у другім жа – на рэлігійнай. Полацкі помнік уяўляе сабой своеасаблівую стэлу. Сама святая зноў прадстаўлена ў манаскім адзенні, у правай руцэ яна трымае створаны па яе замове Крыж, а ў левай – ружанец. Крыж з’яўляецца сімвалам хрысціянства, а ружанец – сімвал малітвы. Відавочна, што тут адлюстроўваецца больш сталы вобраз святой. Гэта можна заўважыць па выразе твару: яна глядзіць спакойна і строга, яе вочы стомленыя і дзе-нідзе праяўляюцца маршчыны. Святая ўзнімае руку з крыжам, быццам благаслаўляе Беларусь і яе жыхароў.

Апошняя ў цяперашні час скульптура святой была ўсталявана ў Мінску ў 2002 годзе. Яе аўтар, Анатоль Артымовіч, прадставіў уласную інтэрпрэтацыю вобраза. Гэты помнік адрозніваецца ад двух папярэдніх. Перш за ўсё – поза. Калі Ігар Голубеў прадстаўляў святую, якая строга стаіць і глядзіць на людзей, то Анатоль Артымовіч прадставіў Еўфрасіння Полацкую так, быццам яна прысела адпачыць ці памаліцца. Вочы святой заплюшчаны, а галава нахілена. Вакол яе “ззяе” німб, што ўказвае на статус Еўфрасінні Полацкай як святой. Цікава, што дадзены сімвал выяўлены толькі ў гэтым помніку. На плячах святой сядзяць два галубы. Гэтых птушак у кампазіцыі сімвалізуюць Святы Дух і чысціню душы. Аднак варта адзначыць яшчэ адзін цікавы момант, які непасрэдна звязаны з агіяграфічным вобразам. З “Жыція…” вядома, што Еўфрасіння пастрыгла ў манашкі дзвюх сваіх сясцёр і навучала іх. Вось як пра гэта напісана ў тэксце агіяграфіі: “Сёстраў жа так павучала: “Вось, сабрала вас, нібы птушанятаў, пад крылы свае і на пашы, нібы авечак, каб вы пасвіліся ў Божых наказах. А я з лёгкім сэрцам стараюся вучыць вас, бачачы плён вашай працы, і такі дождж вучэння на вас праліваю!” [1]. Магчыма, дзве птушкі якраз сімвалізуюць сясцёр прападобнай. У руках святая трымае кнігу і, як і ў полацкім помніку, Крыж, што зноў жа ўказвае і на рэлігійную дзейнасць, і на асветніцкую.

Такім чынам, скульптары інтэрпрэтуюць вобраз Еўфрасінні Полацкай згодна з агіяграфічным канонам, звяртаючы ўвагу на розныя аспекты жыцця святой.

Усяго ў Беларусі тры помнікі Еўфрасінні Полацкай, тры скульптурныя ўвасабленні вобраза прападобнай. Аднак, на нашу думку, у дадзены пералік варта ўключыць і манеты, выпушчаныя ў гонар святой. Гэта абгрунтоўваецца тым, што манету можна аднесці да пласкай скульптуры – рэльефу, а іменна барэльефу. Бо, згодна з

Беларускай энцыклапедыяй, барэльеф – гэта “від скульптуры, дзе пукатая частка выявы выступае над плоскасцю фону не больш як на палову аб’ёму <…> Часам барэльефам упрыгожваюць пастаменты помнікаў, стэлы, мемарыяльныя дошкі, манеты, медалі, гемы” [3, с. 336]. У дадзеным выпадку памятныя манеты змяшчаюць на сабе барэльеф.

Памятная манета “900-годдзе Еўфрасінні Полацкай” была выпушчана ў 2001 годзе ў серыі “Рэлігійныя канфесіі Беларусі”, мае намінал дваццаць і адзін рубель. Яе дызайн распрацавала беларуская мастачка Святлана Заскевіч [4]. Выява Еўфрасінні Полацкай размяшчаецца на рэверсе манеты. Святая прадстаўлена ў профіль, яна апранута ў манаскае адзенне і ў руцэ трымае ружанец. Галава святой схіленая, а правая рука паднята ў малітоўным жэсце. Побач – лесвіца і ўваход у келлю. Добра вядома, што Еўфрасіння мела ўласную келлю, дзе малілася і перапісвала кнігі: “…і так ёй сказаўшы, адпусціла яе ў сваю келлю” [1]. На дзвярах келлі – выява Крыжа, які непарыўна звязаны з вобразам святой.

Наступная манета “Прападобная Еўфрасіння Полацкая” была адчаканена ў 2008 годзе ў серыі “Праваслаўныя святыя”. Яе дызайнеркамі выступілі Святлана Заскевіч, якая распрацавала аверс, і польская мастачка Уршула Валежак, якая працавала над рэверсам [5]. Вобраз святой Еўфрасінні Полацкай, як і ў першай манеты, размешчаны на рэверсе. Цікава, што вобраз беларускай святой стварыла мастачка з Польшчы. На манеце Еўфрасіння Полацкая прадстаўлена ў анфас, яна апранутая ў манаскае адзенне і ў руцэ трымае Крыж. У дадзеным вобразе ўжо ўвасоблена тое, што Еўфрасіння Полацкая прылічана да ліку святых – над галавой яе выяўлены німб. За спінай прападобнай – размешчаны арнамент, які часта можна сустрэць у іканапісу. А таксама на манеце размешчаны чатыры крышталі чырвонага і зялёнага колераў,

якія адпавядаюць колерам сцяга Беларусі. Гэта сведчыць, на нашу думку, пра тое, што Еўфрасіння Полацкая з'яўляецца заступніцай Беларусі.

Такім чынам, мы бачым, што аўтары інтэрпрэтуюць вобраз святой Еўфрасінні Полацкай дыхатамічна. З аднаго боку, яна прадстаўляецца як рэлігійная дзеячка, манахіня, што аддана служыць Богу. З другога – гэта асветніца, якая апекавалася навучаннем "люду простага".

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Жыціе Еўфрасінні Полацкай [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу:. https://knihi.com/none/Zycije_Jeufrasinni_Polackaj.html#chapter2. – Дата доступу: 15.01.2024

2. Левшун, Л.В. Евфросинья Полоцкая. Имя в истории. «Житие преподобной Евфросиньи, игуменьи Полоцкой» в контексте агиологической традиции slavia orthodoxa. Издание 2-е, исправленное и дополненное / Л.В. Левшун. – Мн., 2023. – 368 с.

3. Лявонава, А.К. Барэльеф / А.К. Лявонава // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. Т. 2: Аршыца – Беларусцы / Рэдкал.: Г. П. Пашкоў і інш.. – Мн. : БелЭн, 1996. – Т. 2. – С. 336 – 337

4. Памятная монета "900–летие Ефросинии Полоцкой" [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://mgroshi.by/catalog/coins-682. – Дата доступу: 25.01.2024

5. Памятная монета "Преподобная Евфросиния Полоцкая" [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://mgroshi.by/catalog/coins-508. – Дата доступу: 25.01.2024